http://www.uzdanews.by/?p=19444




# ГАРМАНІЧНАЯ ПРЫГАЖОСЦЬ БАЯВОГА МАСТАЦТВА

***15.03.2013*, Ксенія АНДРОСІК, Павел ПРАХАРЭНКА *(фота).***




Напачатку вясны ў спартыўнай зале раённай гімназіі былі праведзены традыцыйныя рэспубліканскія спаборніцтвы па шатакан каратэ-до, прысвечаныя Міжнароднаму дню жанчын.



Насычаная праграма мерапрыемства, вытанчаныя рухі спартсменаў у кімано падчас дэманстрацыі свайго майстэрства стварылі непаўторную атмасферу, прасякнутую чароўнай і экзатычнай энергетыкай усходняга баявога мастацтва. Спаборніцтвы па каратэ-до “Гармонія шатакана” праведзены сёлета 13-ты год запар.



Больш за дзвесце прадстаўнікоў розных клубаў выйшлі на спартыўную арэну, каб пазмагацца за званне лепшых у сваіх узроставых катэгорыях. Упершыню за гісторыю правядзення спаборніцтваў іх удзельнікі выступалі ў 31 раздзеле праграмы. Акадэмію каратэ (трэнер-прадстаўнік — Вольга Вількіна) прадстаўлялі 23 спартсмены і 6 суддзяў.



У лік пераможцаў увайшлі члены 12 беларускіх клубаў, якія прадстаўлялі Мінск, Зельву, Карэлічы, Паставы, Рось, Смалявічы і Узду. Віншаванні і падарункі ад суддзяў і ганаровых гасцей прымалі Анастасія Цямрук (I, I, IV месцы), Дар'я Гайдалёнак (I, II, III), Вячаслаў Цямрук (I, II, III), Дзяніс Аляксееў (I), Уладзімір Мартыновіч (I), Ільля Бабаеў (II, II), Арцём Карпунін (II), Данііл Уласаў (III), Дзяніс Тамковіч (III), Вольга Кутузава (IV), Глеб Мартынаў (IV) і Ганна Свідзерская (IV).



Спецыяльныя прызы атрымалі маці-гераіня шасці дзетак, прызёр рэспубліканскіх спаборніцтваў Алена Корвін-Кучынская (намінацыя "Старэйшая мама") і Анастасія Цямрук (намінацыя "Самая ўніверсальная спартсменка").



Не былі абдзелены ўвагай і астатнія ўдзельнікі спаборніцтваў. Арганізатары спартыўнага мерапрыемства (Беларуская федэрацыя шатакан каратэ-до, уздзенскі клуб “Бушыдо”, аддзелы па справах моладзі аблвыканкама і райвыканкама, ад-дзел фізічнай культуры, спорту і турызму, райкам БРСМ, раённая арганізацыя РГА “Белая Русь”) падрыхтавалі для іх сувеніры і шчырыя словы ўдзячнасці за вядзенне здаровага ладу жыцця, захапленне спартам, імкненне да самаўдасканалення ў выбранай справе.



Завяршылася свята прыгажосці ўсходняга баявога мастацтва чаяпіццем, удзел у якім прынялі ўсе прысутныя.